# *РОЛІЧ ВОЛЬГА МІХАЙЛАЎНА*

г.Шчучын. Саломапляценне.



Роліч Вольга Міхайлаўна, майстар народных мастацкіх рамёстваў у аддзеле рамеснай дзейнасці і народнага мастацтва ДУК “Шчучынскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці”, з’яўляецца носьбітам элемента нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь “Беларускія мастацкія практыкі саломапляцення” (Мастацкія практыкі саломапляцення Гродзенскай вобласці).

Вольга Міхайлаўна нарадзілася 21 лютага 1973 года ў вёсцы Ручыцы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1990 годзе пасля заканчэння Ракавіцкай сярэдняй школы пайшла працаваць швачкай на Гродзенскую фабрыку “Динамо”. З 2002 года працавала кіраўніком гуртка (на той час) у раённым цэнтры рамёстваў г. Шчучына. З 2017 года і па сёняшні дзень працуе майстрам у аддзеле рамеснай дзейнасці і народнага мастацтва.

Творчыя здольнасці ў Вольгі Міхайлаўны праявіліся яшчэ ў малодшым узросце. Першымі работамі былі сплеценыя з травы і саломы лялькі, якія навучыла рабіць матуля Эльяшэвіч Леакадзія Іванаўна. Кожная наступная работа з саломкі і травы Вольгі Роліч адрознівалася вытанчанасцю і густам. З літаратурных выданняў маладая майстрыха авалодала простымі прыёмамі пляцення, ведамі па нарыхтоўцы матэрыялу, яго асаблівасцях. Пасля, падчас працы ў аддзеле рамеснай дзейнасці і народнага мастацтва, Вольга Міхайлаўна ўдала пераняла майстэрства саломапляцення ад мясцовых майстроў Бярдоўскай Леакадзіі Іосіфаўны і Купрык Алены Анатольеўны.

Сёння Роліч В.М. умела выкарыстоўвае дэкаратыўна-пластычныя асаблівасці пляцення з саломы, якія пастаянна развівае, удасканальваючы новымі мастацкімі прыёмамі і тэхнікамі. Майстрыха працуе ў розных тэхніках плоскага і аб’ёмнага пляцення, саламянай пластыкі, дэкаратыўнай скульптуры, змяшанай тэхніцы. Кожная работа створана далікатна і па-майстэрску.





Вольга Міхайлаўна ўсе свае веды і ўменні па саломапляценні перадае маладому пакаленню праз майстар-класы падчас розных мерапрыемстваў. Яна валодае выдатнымі арганізатарскімі здольнасцямі, што дазволіла ёй стварыць на базе аддзела рамеснай дзейнасці і народнага мастацтва аматарскае аб’яднанне майстроў народнай творчасці “Спадчына”.

Акрамя саломапляцення майстар валодае навыкамі ткацтва габеленаў і паясоў. Самастойна пераймае ўзоры карункапляцення з этнаграфічных збораў і распрацоўвае схемы для вязання шэдэлкам.

Роліч В.М. з’яўляецца актыўнай удзельніцай шматлікіх міжнародных, рэспубліканскіх, абласных, рэгіянальных фестываляў, святаў традыцыйнай культуры, сярод іх: рэгіянальнае свята-кірмаш вырабаў рамеснікаў “Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня” (штогод, г.Гродна); абласны фестываль традыцыйнай культуры “Скарбы Гродзеншчыны” (2022 год, г. Смаргонь; 2024 год, г. Гродна); абласны фестываль рэгіянальнага фальклору “Панямоння жыватворныя крыніцы” (г. Шчучын, 2021 год); адкрыты конкурс-пленэр майстроў па саломапляценні “Саламяны цуд” у рамках свята “Ганненскі кірмаш” (г.п. Зэльва, 2022, 2024 гады); рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур (г. Гродна, 2022, 2024 гады); рэспубліканскі фестываль-кірмаш рамёстваў “Вясновы букет” (г. Мінск, 2022 - 2024 гады); рэспубліканскае свята “Купалле” (“Александрыя збірае сяброў”) (Шклоўскі раён Магілёўскай вобласці, 2022, 2024 гады) і інш. Саламяныя вырабы Роліч В.М. былі прадстаўлены: ў экспазіцыі Гродзенскай вобласці ў беларускім павільёне ВДНГ у рамках Міжнароднага форуму “Расія” (г.Масква, 2024 год); на выстаўцы саломапляцення, арганізаванай у рамках 17-й сесіі міжурадавага пасяджэння ЮНЕСКА па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2022 год, Марока, г.Рабаце).

За значны ўклад у развіццё і адраджэнне народных рамёстваў Вольга Міхайлаўна Роліч мае шматлікія ўзнагароды: Ганаровая грамата Шчучынскага райвыканкама за добрасумленную плённую працу, значны асабісты ўклад у развіццё культуры (2022 год); падзячны ліст за ўдзел у выстаўцы-прэзентацыі Гродзенскай вобласці “Живёт в народе красота” ў рамках XX Міжнароднага фестывалю народных промыслаў “Золотая хохлома” (2024 год, г. Сямёнаў, Расійская Федэрацыя); дыплом III ступені абласнога свята-конкурсу майстроў народных мастацкіх рамёстваў па саломапляценні “Папараць-кветка-2024” у рамках XXXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” (г.Віцебск, 2024 год), Ганаровая грамата ўпраўлення культуры за высокі прафесіяналізм і творчую дзейнасць, значны асабісты ўклад у развіццё і прапаганду беларускай культуры (2024 г.).

За шматгадовую працу па захаванні і папулярызацыі традыцыйных рамёстваў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у студзені 2025 года прысвоіла В.М. Роліч званне “Народны майстар”.






